Сайт: http://вбиблио.бел/
Эл. пошта:
bn-22@vitobl.by
Тэлефон: 8 (02151) 6-32-95



ВЕРХНЯДЗВІНСКАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ
РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА ім. Тараса Хадкевіча

# Верхнядзвінскі край




**КРАЯЗНАЎЧЫ КАЛЯНДАР**

**2026**

ББК 92.5
В 36

Складальнік: Н. С. Глацёнак
Рэдактар  С. В. Лобан
Адказны за выпуск Л. А. Куўшынава

**Верхнядзвінскі край. 2026** : краязнаўчы каляндар / Цэнтральная раённая бібліятэка імя Тараса Хадкевіча, Аддзел абслугоўвання і інфармацыі; [склад. Н.С. Глацёнак]. – Верхнядзвінск, 2025.  – 24 с.

Краязнаўчы каляндар адлюстроўвае найбольш значныя гістарычныя даты грамадскага, навуковага і культурнага жыцця Верхнядзвінскага краю, юбілейныя даты знакамітых дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, герояў вайны і працы, прадстаўнікоў літаратуры і мастацтва, якія пакінулі значны след у гісторыі і культуры Верхнядзвіншчыны.

Друкаваны варыянт календара з 2006 года захоўваецца ў фондзе чытальнай залы Верхнядзвінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Т. Хадкевіча, электронны з 2015 года – на афіцыйным сайце  http://вбиблио.бел/

© Верхнядзвінская цэнтральная раённая
бібліятэка імя Тараса Хадкевіча, 2025

Падрыхтоўка тэксту, камп'ютарная вёрстка
і мастацкае афармленне Н. С. Глацёнак
Адказны за выпуск Л. А. Куўшынава

Надрукавана на ксераксе Верхнядзвінская цэнтральная
раённая бібліятэка імя Тараса Хадкевіча
211631 г. Верхнядзвінск, вул. Савецкая, д. 34
E-mail: bn-22@vitobl.by
Тыраж 20 экз.



# У 2026 годзе спаўняецца:

| | |
|---|---|
| **640 гадоў** | таму (1386) у пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца горад **Дрыса** (Верхнядзвінск). |
| **520 гадоў** | таму (1506) заснавана в. **Сар'я**, аграгарадок з 2009 года. |
| **295 гадоў** | таму (1731) заснаваны **Забельскі калегіум** пры дамініканскім манастыры святога Юрыя. (Забелы каля аг. Валынцы). |
| **160 гадоў** | таму (1866) заснавана в. **Бігосава**, аграгарадок з 2011 года. |
| **155 гадоў** | таму (1871) пабудаваны **Чыгуначны вакзал** Верхнядзвінск (Дрыса). |
| **115 гадоў** | таму (1911) нарадзіўся **Бурак Андрэй Мацвеевіч** (1911-1943), Герой Савецкага Саюза. Ураджэнец в.Асвеіца. |
| **115 гадоў** | таму (1911) пабудаваны **Касцёл Найсвяцейшай Тройцы**, каталіцкі храм, помнік архітэктуры неараманскага стылю. Гісторыка-культурная каштоўнасць рэспубліканскага значэння (в. Росіца). |
| **100 гадоў** | таму (1926) пабудаваны **Чыгуначны вакзал** ў аг. Бігосава, помнік архітэктуры мадэрну. Гісторыка-культурная каштоўнасць рэспубліканскага значэння. |

## СТУДЗЕНЬ

**35 гадоў** таму (1991) прысвоена назва «народны» **клубу «Ветэран»** ДУК «Верхнядзвінскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»

**1 студзеня — 30 гадоў** таму (1996) заснаваны **вузел электрасувязі** г. Верхнядзвінска Полацкага ЗВЭ Віцебскага філіяла РУП «Белтэлекам».

**1 студзеня — 30 гадоў** таму (1996) заснавана **аддзяленне паштовай сувязі** №1 г. Верхнядзвінска Полацкай РВПС Віцебскага філіяла РУП «Белпошта».

**3 студзеня — 75 гадоў** таму (1951) нарадзіўся **Ананчанка Канстанцін Ануфрыевіч** (1951-2009), вучоны ў галіне методыкі выкладання матэматыкі, доктар педагагічных навук, прафесар. Ураджэнец в. Казуліна.

**16 студзеня — 170 гадоў** таму (1856) нарадзіўся **Аскназі Ісаак Львовіч** (1856-1902), жывапісец, акадэмік гістарычнага жывапісу. Ураджэнец г. Дрысы (Верхнядзвінск).

## ЛЮТЫ

**2 лютага — 115 гадоў** таму (1911) нарадзіўся **Героднік Геннадзь (Генрых) Іосіфавіч** (1911-2000), настаўнік, пісьменнік. Ураджэнец г.п. Асвея.

**15 лютага — 95 гадоў** таму (1931) нарадзіўся **Рудкоўскі Іосіф Максімавіч** (1931-1996), перадавік нафтаздабыўной прамысловасці, Герой Сацыялістычнай працы (1966). Ураджэнец в. Бузова.

**22 лютага — 25 гадоў** таму (2001) прысвоена назва «узорны» харэаграфічнаму калектыву **«Лялькі»** ДУК «Верхнядзвінскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»



## 520 гадоў таму (1506) заснавана в. Сар'я, аграгарадок з 2009 года

**Са́р'я** — аграгарадок у Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці, за 20 км на поўнач ад Верхнядзвінска, на правым беразе ракі Сар'янкі. З'яўляецца цэнтрам Сар'янскага сельсавета.

Сар'я ўпершыню згадваецца ў летапісе ў 1506 годзе. У той час землі належалі Сапегам. Існуюць дзве версіі паходжання назвы. Першая абвяшчае, што мястэчка атрымала найменне ад назвы ракі Сар'янкі. Прыхільнікі другой версіі сцвярджаюць, што назва Сар'я паўстала дзякуючы вольным землепашцам-сар'янам, якія наймаліся ў войскі да феадалаў.

У 1753 годзе яна была выкуплена Лапацінскімі.

Перад вайной, у вёсцы жыло 193 чалавекі ў 34 дварах. У вёсцы ў Вялікую Айчынную вайну дзейнічала Сар'янскае патрыятычнае падполле. У лютым 1943 года войскамі вермахта былі спалены 34 дамы, забіта 69 чалавек.

Першае, што варта ўбачыць у Сар'і, — Успенская царква. Будынак з чырвонай цэглы ў неагатычным стылі быў пабудаваны яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя і пасля гэтага амаль не змяняўся.

У крокавай дасяжнасці ад храма размяшчаюцца два помнікі. Першы ўсталявалі ў гонар сям'і Лапацінскіх, па ініцыятыве якіх і была пабудавана Успенская царква. Другі — помнік святым Пятру і Фяўронні Мурамскім, ля яго падножжа дабраслаўляюць новыя сем'і на шчаслівае жыццё ў каханні і згодзе.

Калісьці ў Сар'і існавала сядзіба, ад якой, на жаль, засталася толькі ўязная брама і частка прысядзібнага парку. Апошні ўяўляе сабой авальны ўчастак на абодвух берагах ракі Сар'янкі з перакінутым праз яе мостам. Даследчыкі налічылі каля 30 відаў дрэў, сярод якіх ёсць вельмі рэдкая веймутская хвоя. У 2013 годзе тут адрэстаўравалі ўязную браму, бакавыя калоны і нават усталявалі радавы герб сям'і Лапацінскіх.

Захавалася ў Сар'і і памяць пра ваенныя гады: мемарыяльная дошка, брацкая магіла і помнік ахвярам фашызму.



**27 лютага — 75 гадоў** таму (1951) нарадзіўся **Малей Аляксандр Васільевіч**, беларускі мастак. Член Беларускага саюза мастакоў (1982). Ураджэнец в. Садкоўшчына.

## САКАВІК

**80 гадоў** таму (1946) адкрыты **Асвейскі Дом культуры**.

**2 сакавіка — 110 гадоў** таму (1916) нарадзілася **Сізко Вера Аляксандраўна** (1916-1999), беларускі музыказнавец, музычны крытык, педагог, даследчык беларускага опернага мастацтва. Ураджэнка г. Дрысы ( Верхнядзвінск).

**30 сакавіка — 35 гадоў** таму (1991) адкрыты **Бігосаўскі Дом культуры**.

## КРАСАВІК

**25 гадоў** таму (2001) прысвоена назва «народны» юнацкаму тэатру мініяцюр **«Сборная нашего города»** ГУК "Верхнядзвінскі цэнтр культуры і народнай творчасці".

**1 красавіка — 100 гадоў** таму (1926) нарадзіўся **Дашчонак Уладзімір Уладзіміравіч** (1926-2022), Ганаровы грамадзянін Верхнядзвінскага раёна (2019). Ураджэнец в. Маторына Расонскага раёна.

**5 красавіка — 90 гадоў** таму (1936) нарадзілася **Шушкевіч Ганна Паўлаўна** (1936-2021), перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Герой Сацыялістычнай працы (1971). Ураджэнка в. Падгайскія.

**13 красавіка — 75 гадоў** таму (1951) нарадзілася **Дзевяковіч Ларыса Іванаўна**, настаўнік гісторыі, краязнаўца, Ганаровы грамадзянін Верхнядзвінскага раёна (2022). Ураджэнка г. Дрысы (Верхнядзвінск).

**15 красавіка — 110 гадоў** таму (1916) нарадзілася **Барсток Марына (Марыя) Мікітаўна** (1916-1994), беларускі савецкі паэт, крытык і літаратуразнаўца.
Кандыдат філалагічных навук (1950). Член Саюза пісьменнікаў СССР (1951). Ураджэнка в. Наркавічы.

## МАЙ

**1 мая — 85 гадоў** таму (1941) нарадзіўся **Дзевяковіч Аляксандр Сцяпанавіч** (1941-1983), воін-інтэрнацыяналіст. Загінуў у Афганістане 11.01.1983 г. Ураджэнец в. Шалягова.

**8 мая — 90 гадоў** таму (1936) нарадзіўся **Масяйчонак Рамуальд Піліпавіч** (1936-1991), гісторык, краязнаўца, былы дырэктар СШ №2 г. Верхнядзвінска. Ураджэнец ст. Асінаўка Аршанскага раёна.

**23 мая — 75 гадоў** таму (1951) нарадзіўся **Счасны Валерый Ігнатавіч**, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў (1993). Ураджэнец г. Верхнядзвінска.

## ЧЭРВЕНЬ

**12 чэрвеня — 75 гадоў** таму (1951) нарадзіўся **Пятроў Аляксандр Мікалаевіч**, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў (1993). Ураджэнец аг. Боркавічы.

**28 чэрвеня — 80 гадоў** таму (1946) нарадзіўся **Рудой Васіль Іосіфавіч** (1946-2014), капітан 1 ранга ваенна-марскога флоту, пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі (2010). Ураджэнец г.п. Асвея.






**Чыгуначны вакзал у аг. Бігосава** — унікальны архітэктурны помнік пачатку XX стагоддзя стылю мадэрн з абарончымі элементамі.

Гэта абумоўлена тым, што станцыя знаходзілася ў памежным раёне. Сёння аблічча станцыі трохі зменена, але захаваліся галоўныя архітэктурныя рысы будынка: шпіль і вежкі, масіўныя сцены і ганак, паўкруглая форма вокнаў над цэнтральным уваходам.

Пра гісторыю вакзала могуць падрабязней распавесці ў бібліятэцы, размешчанай у мясцовым Доме культуры. З памятных падзей тут назавуць жалобны цягнік-картэж, які вёз з Рыгі ў Маскву цела знакамітага тэнара Леаніда Собінава. Тут таксама стартаваў кантынентальны пасажырскі цягнік Бігосава-Маньчжурыя.

На паўднёвым фасадзе будынка ўстаноўлены дзве мемарыяльныя дошкі ў памяць пра Героя Савецкага Саюза Э. В. Лаўрыновіча, які нарадзіўся на Бігасоўшчыне, і танкістаў, якія ў 1944 годзе вызвалілі пасёлак, захаваўшы вакзал ад разбурэння.

## 160 гадоў таму (1866) заснавана в. Бігосава, аграгарадок з 2011 года

**Бігосава** — аграгарадок у Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці, на рацэ Росіца. Адміністрацыйны цэнтр Бігосаўскага сельсавета. Чыгуначная станцыя на лініі Полацк — Даўгаўпілс. За 18 км на паўночны захад ад горада Верхнядзвінска, за 193 км ад Віцебска.

Паўстаў у 1866 годзе пры будаўніцтве Рыга-Арлоўскай чыгункі. Першапачаткова станцыйнае паселішча, як і станцыя, называлася Георгіеўская, складалася з трох будынкаў: сціплага драўлянага будынка станцыі, пакгаўза і жылога дома. Згодна з архіўнымі звесткамі 1904 года станцыя Георгіеўская налічвала 3 двары, 23 жыхароў, якія абслугоўваліся Росіцкай паштова-тэлеграфнай канторай.

З 20 верасня 1944 года Бігосава было ў складзе Полацкай вобласці, з 8 студзеня 1954 года — у Віцебскай вобласці. У Верхнядзвінскім раёне Бігосава апынулася 25 снежня 1962 года.

У 1957 годзе ў Бігосаве быў пабудаваны завод «Зааветінструмент» (сучаснае ААТ «Інвет») — горадаўтваральнае прадпрыемства ў Верхнядзвінскім раёне.

У 1994 годзе пачала дзейнічаць рымска-каталіцкая Тройцкая капліца. У 2005 годзе прыход Арханёла Міхаіла, які адносіцца да РПЦ.

Па ўспамінах старажылаў у 1910 годзе мясцовымі памешчыкамі было разыграна ў карты права змяніць назву чыгуначнай станцыі. Удачлівым аказаўся ўладальнік маёнтка Бігусава Вітольд Нітаслаўскі. У 30-я гады XX стагоддзя назва была зменена на Бігосава.



## ЛІПЕНЬ

| | |
|---|---|
| **40 гадоў** | таму (1986) заснавана адкрытае акцыянернае таварыства (ААТ) **«Верхнядзвінскі райаграсервіс»**, (Дрысенская МТС, 1931 г.). |
| **60 гадоў** | таму (1966) адкрыты **Лявонішанскі сельскі Дом культуры** |
| **29 ліпеня — 65 гадоў** | таму (1961) нарадзіўся **Яроменак Пётр Мікалаевіч** (1961-1982), воін-інтэрнацыяналіст. Загінуў ў Афганістане 13.08.1982 г. Ураджэнец п. Чапаеўскі. |

## ЖНІВЕНЬ

| | |
|---|---|
| **3 жніўня — 95 гадоў** | таму (1931) нарадзіўся **Шымук Барыс Піліпавіч** (1931-2008), краязнаўца, арганізатар і былы дырэктар Валынецкага музея імя І. Чэрскага. Ураджэнец в. Пасадзец Лагойскага раёна. |
| **25 жніўня — 125 гадоў** | таму (1901) нарадзіўся **Грыгаровіч Уладзімір Іосіфавіч** (1901-1975), генерал-маёр, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ураджэнец в. Юсціянава. |

## ВЕРАСЕНЬ

| | |
|---|---|
| **1 верасня — 50 гадоў** | таму (1976) адкрыта дзяржаўная вучэбна-спартыўная ўстанова **«Верхнядзвінская спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву»**. |

## КАСТРЫЧНІК

**50 гадоў** — таму (1976) адкрыты **Запруддзеўскі сельскі Дом культуры**

**24 кастрычніка — 105 гадоў** — таму (1921) нарадзілася **Траян Надзея Віктараўна** (1921-2011), Герой Савецкага Саюза, кандыдат медыцынскіх навук (1961), старшы лейтэнант медыцынскай службы. Ураджэнка г. Дрысы (Верхнядзвінск).

## ЛІСТАПАД

**18 лістапада — 35 гадоў** — таму (1991) заснавана Верхнядзвінская мытня. Зараз **Верхнядзвінскі мытны пост** Віцебскай мытні (2010).

**20 лістапада — 95 гадоў** — таму (1931) заснавана раённая газета «Звязда на рубяжы» (зараз «Дзвінская праўда»).

**23 лістапада — 210 гадоў** — таму (1816) нарадзіўся **Вярыга-Дарэўскі Арцём Ігнатавіч** (1816-1884), беларускі паэт, драматург, публіцыст, выпускнік Забельскага дамініканскага калегіума.

## СНЕЖАНЬ

**55 гадоў** — таму (1971) адкрыта дзяржаўная ўстанова адукацыі **«Санаторны дзіцячы сад №3 г. Верхнядзвінска»**.

**3 снежня — 105 гадоў** — таму (1921) заснавана **Прадстаўніцтва Белдзяржстраха па Верхнядзвінскаму раёну**.

**6 снежня — 55 гадоў** — таму (1971) нарадзіўся **Піваронін Васіль Аляксеевіч**, беларускі гісторык, кандыдат гістарычных навук (2000), дацэнт (2005).
Ураджэнец в. Дзёрнавічы.






### ТРАЯН НАДЗЕЯ ВІКТАРАЎНА
**(24. 10. 1921, г. Верхнядзвінск – 07. 09. 2011, г. Масква)**
**Герой Савецкага Саюза**

Удзельніца партызанскага руху ў Мінскай вобласці. Герой Савецкага Саюза (1943). Скончыла 1-ы Маскоўскі медыцынскі інстытут (1947), кандыдат медыцынскіх навук (1961). Член КПСС з 1946 г.

У Вялікую Айчынную вайну была падпольшчыцай у Смалявічах. З яе ўдзелам была створана падпольная камсамольская арганізацыя, якая перапраўляла людзей у партызаны, збірала звесткі пра ворага, дапамагала сем’ям партызан.

З ліпеня 1942 г. — разведчыца партызанскай брыгады Дзядзькі Колі. Удзельніца падрыхтоўкі знішчэння ката беларускага народа генеральнага камісара Беларусі гаўляйтэра В. Кубэ.

Пасля вайны — на грамадскай рабоце, выкладчык ВНУ, прарэктар 1-га Маскоўскага медыцынскага інстытута, з’яўлялася членам Прэзідыума Усесаюзнага Савета ветэранаў вайны і працы, старшыня выканкама Саюза таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца СССР.

Імя Героя Савецкага Саюза Надзеі Віктараўны Траян прысвоена СШ № 2 г. Верхнядзвінска (2022).



**ШЫМУК БАРЫС ПІЛІПАВІЧ**
**(03. 08. 1931, в. Пасадзец Лагойскага раёна Мінскай вобласці – 30. 10. 2008, аг. Валынцы)**

Скончыў Барысаўскае педагагічнае вучылішча (1950). Працаваў у Пасадскай пачатковай школе. Пасля службы ў арміі скончыў гістарычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута (1958). Працаваў настаўнікам гісторыі спачатку ў Лагойскім раёне, затым у г. Баранавічы, а з 1973 года — у Навасвальнянскай школе Верхнядзвінскага раёна. У гэты час пачаў працу над стварэннем школьнага краязнаўчага музея І. Чэрскага. За дзейнасць па збору інфармацыі аб знакамітым земляку ён узнагароджваецца Ганаровай граматай «За большие заслуги перед Советской географией и Географическим Обществом СССР», удастоены ганаровага звання члена Геаграфічнага Таварыства СССР (1979).

20 кастрычніка 1992 года па ініцыятыве Барыса Піліпавіча выканаўчы камітэт Віцебскага абласнога Савета народных дэпутатаў прыняў рашэнне за № 242 «О создании краеведческого музея в д. Волынцы Верхнедвинского района». На пасаду дырэктара музея быў прызначаны Барыс Піліпавіч.



**24 снежня — 30 гадоў** таму (1996) прысвоена назва «народны» вакальна-харэаграфічнаму калектыву «**Ярыца**».

**25 снежня — 75 гадоў** таму (1951) занавана **Камунальнае унітарнае вытворчае сельскагаспадарчае прадпрыемства (КУВСГП) «Дрысенскі»**.

**640 гадоў таму (1386) у пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца горад Дрыса (цяпер Верхнядзвінск)**




З глыбінь стагоддзяў дайшлі да нас звесткі пра Дрысу (Верхнядзвінск) — старажытнейшы горад. Першае летапіснае ўпамінанне аб ім адносіцца да 1386 года, калі тутэйшы замак, што з’яўляўся асноўнай крэпасцю, быў спалены Андрэем Полацкім.

З XV стагоддзя Дрыса была асобнай, падпарадкаванай Полацку, воласцю, пра што ўпамінаецца ў пагадненні паміж вялікім князем літоўскім Аляксандрам і вялікім князем маскоўскім Іванам III ад 25 сакавіка 1503 года. У Лівонскую вайну Дрыса была ўзята войскам Івана IV Грознага і ўтрымлівалася ім 19 гадоў. У гэты час, непадалёку ад горада, была пабудавана крэпасць Сокал, якая аказала дапамогу асаджанаму Полацку. У 1582 годзе горадам авалодаў С. Баторый.

Дрыса ў ліку іншых беларускіх гарадоў увайшла ў склад Расійскай імперыі (Полацкая правінцыя Пскоўскай губерніі). З 1776 года — гэта павятовы горад Полацкай губерніі. З 1796 года ўваходзіла ў склад Беларускай, а з 1802 года — Віцебскай губерняў.

У 1778 годзе адбылося зацверджанне рэгулярнага плана Дрысы. 27 верасня 1781 года паселішча атрымала герб: «у залатым полі Пагоня з чырвоным шчытом, на якім срэбны падвойны крыж». Наяўнасць у горада герба сведчыла пра атрыманне права на самакіраванне.

У пачатку Айчыннай вайны 1812 года каля Дрысы быў умацаваны лагер і галоўная кватэра камандуючага 1-й рускай арміяй М.Б. Барклая дэ Толі. У памяць аб тых падзеях у 1912 годзе ў горадзе быў установлены абеліск, які захаваўся да нашых дзён. Дрысенскі лагер пабудаваны па плану прускага генерала Фуля, ваеннага саветніка Аляксандра I, ён займаў тэрыторыю каля 14 кв. км. Меркавалася, што ў выпадку нападу напалеонаўскіх войск на Расію, 1-я Заходняя армія пад камандаваннем М. Б. Барклая дэ Толі





**РУДОЙ ВАСІЛЬ ІОСІФАВІЧ**
**(28. 06. 1946, г. п. Асвея – 01.11. 2014, г. Верхнядзвінск)**

Скончыў Асвейскую сярэднюю школу (1964). Скончыў Ленінградскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча імя М.В. Фрунзе. Васіль Іосіфавіч праслужыў у Ваенна-марскім флоце 28 гадоў (17 з іх — на атамных падводных лодках). Капітан 1-га рангу ў запасе.

З 1995 па 2003 гады ўзначальваў раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Пісаў прозу і вершы. Друкаваўся ў часопісах «Западная Двина», «Новая Немига литературная», у газетах «Во славу Родины» і «Дзвінская праўда». Выдадзены кнігі «Сумасшедший экипаж» (2009), «Последний комиссар» (2012), «Судьбы дорога» (2015).

У маі 2010 года прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. У зборніку сучаснай беларускай прозы «Триптих любви», які адзначаны дыпломам рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Лепшы твор года» (2012), змешчаны творы В. Рудога. У кнігу «Три капитана» (2017) увайшлі таксама творы Васіля Іосіфавіча.

Актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці: з’яўляўся старшынёй раённай арганізацыі Беларускага грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз афіцэраў», арганізатарам і кіраўніком ваенна-патрыятычнага аматарскага аб’яднання «Гардэмарыны».

Імя В.І. Рудога прысвоена Асвейскай гарпасялковай бібліятэцы (2015).

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За бездакорную службу ў УС СССР» 1-й, 2-й, 3-й ступеняў і шматлікімі юбілейнымі медалямі.



## МАСЯЙЧОНАК РАМУАЛЬД ПІЛІПАВІЧ
**(8. 05. 1936, ст. Асінаўка Аршанскага раёна – 7. 04. 1991, г. Верхнядзвінск)**

Скончыў гістарычны факультэт БДУ (1965). Працаваў у Асвейскай СШ (1956), у Асвейскай школе-інтэрнаце (1956-1965), у Верхнядзвінскім райкаме КПБ (1973-1979), дырэктарам СШ № 2 г. Верхнядзвінска (1979-1991).

Выкладаў гісторыю ў школе, цікавіўся краязнаўствам. Абараніў курсавую работу «Верхнедвинск: история города» (1963). Выступаў з артыкуламі па гісторыі краю на старонках раённай газеты «Дзвінская праўда». У 1980-я гг. быў ініцыятарам аднаўлення экспазіцыі музея СШ № 2. Аўтар рукапісу «З далёкіх дзён ідзеш, Асвея», які быў выдадзены ў Верхнядзвінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Т. Хадкевіча.



## СЧАСНЫ ВАЛЕРЫЙ ІГНАТАВІЧ
**(23. 05. 1951, г. Верхнядзвінск)**

Беларускі мастак. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута (1973). Удзельнік мастацкіх выставак з 1976 г. Працуе ў станкавым жывапісе (пейзаж, знакавы канструктывізм), дызайне (інтэр'ер, музейныя экспазіцыі). Асноўныя мастацкія творы: «Легенда», «Курган на балоце», «Ураджай сорак першага», «Купалле», «Дзяды», «А ты хто?» і іншыя. Аформіў музей камсамола ў Віцебску. Лаўрэат прэміі ЛКСМ Віцебшчыны. Член Беларускага саюза мастакоў (1993). Удзельнік першых пленэраў, прысвечаных К. Малевічу, Я. Драздовічу.



адыдзе ў Дрысенскі лагер і тут затрымае наступленне галоўных варожых сіл.

Горад доўгі час заставаўся адсталым павятовым цэнтрам. Насельніцтва цярпела, пакутавала ад эпідэмій і навадненняў. У 1855 годзе, як сведчыць «Памятная кніжка Віцебскай губерніі на 1864 г.», увесь горад, акрамя 7 дамоў, быў затоплены. Мала што змянілася ў павеце і пасля адмены прыгоннага права. У той час тут дзейнічалі ўсяго 4 дробныя прадпрыемствы з 28 работнікамі. У 1866 годзе паблізу Дрысы была пракладзена чыгунка Полацк-Дзвінск (зараз Даўгаўпілс). Як чыгуначная станцыя, Дрыса з'яўлялася адным з галоўных пунктаў вывазу лёну за мяжу.

У 1905 годзе ў горадзе было 14 дробных прамысловых прадпрыемстваў, гарадское і прыходскае вучылішчы, ніжэйшая рамесная школа, бальніца, аптэка. Цяжкія ўмовы жыцця, беспраўе, эксплуатацыя штурхалі працоўных на барацьбу супраць самадзяржаўя. Буйныя сялянскія хваляванні адбываліся ў 1905 годзе.

Савецкая ўлада ў Дрысе ўстаноўлена ў лістападзе 1917 года. У лютым 1918 года, за некалькі дзён да акупацыі горада войскамі кайзераўскай Германіі, У. І. Ленін накіраваў старшыні Дрысенскага Савета рабочых дэпутатаў Л. Б. Урбану тэлеграму аб арганізацыі супраціўлення ворагу і мерах на выпадак, калі давядзецца пакінуць горад. І усё ж Дрыса была акупіравана: спачатку — нямецкімі войскамі, затым — да кастрычніка 1920 года — войскамі буржуазнай Польшчы.

З 17 ліпеня 1924 года — цэнтр Дрысенскага раёна. З 3 ліпеня 1925 — мястэчка, з 27 верасня 1938 года — горад. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны на яго тэрыторыі працавалі ўжо лесапільны, 2 цагельныя і 4 ільнозаводы, 2 машынна-трактарныя станцыі, калгасы і саўгасы, у распараджэнні якіх было каля 70 трактароў. У горадзе разгарнулася камунальнае і жыллёвае будаўніцтва, адкрыўся тэатр.

Усё абарвала вайна. Горад акупіраваны 3 ліпеня 1941 года. Нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі ў горадзе і раёне 6 584 чалавекі (паводле актаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў), у т. л. 2 лютага 1942 года ў гета ў Дрысе 769 яўрэяў. У Дрысе стаяў нямецка-фашысцкі гарнізон (да 200 салдат і афіцэраў). Жыхары раёна ў 1942 годзе перадалі ў фонд Чырвонай арміі 375 тыс. руб.

Горад вызвалены 12 ліпеня 1944 года воінамі 332-й стралковай дывізіі (палкоўнік Ц.Ф. Ягошын) 83-га стралковага корпуса 4-й ударнай арміі 2-га Прыбалтыйскага фронту ў ходзе Рэжыцка-Дзвінскай аперацыі 1944 года.

Колькасць насельніцтва раёна скарацілася больш чым удвая. Да гэтага часу не аднаўлена 203 вёскі з тых 426, якія былі спалены. На іх месцы ўзвышаюцца маўклівыя курганы, абеліскі пад чырвонай зоркай. Самы вялікі з іх — Курган Дружбы — насыпаны на мяжы Верхнядзвінскага, Себежскага і Лудзенскага раёнаў у гонар баявога братства беларускіх, рускіх, і латышскіх партызан.

8 Герояў Савецкага Саюза дала Радзіме тутэйшая зямля. 5 з іх загінулі ўдалечыні ад роднага дома. А ў Верхнядзвінску ёсць помнік маёру Міхаілу Маскоўскаму і старшаму лейтэнанту Аркадзію Панціелеву, адна з цэнтральных вуліц названа імем камандзіра асобнага сапёрнага батальёна маёра Анатоля Качкара. Гэтыя афіцэры загінулі смерцю храбрых, вызваляючы горад.

У верасні 1944 года Дрыса была ўключана ў Полацкую вобласць, а ў студзені 1954 года — у Віцебскую вобласць.

Верхнядзвінск — такую назву горад атрымаў у снежні 1962 г. — адзін з найбольш добраўпарадкаваных раённых цэнтраў рэспублікі з насельніцтвам 6 771 чалавек (на 1 студзеня 2025 года).

26 ліпеня 2002 года зацверджаны гістарычны герб Верхнядзвінска (Дрысы) з Пагоняй, а 28 лютага 2011 года — новы сцяг горада і раёна. У 1970 г. распрацаваны генеральны план забудовы горада, паводле якога будаўніцтва вялося ўздоўж рэк Заходняя Дзвіна і Дрыса ў гістарычнай частцы горада. У паўднёвай частцы забудаваны мікраараён з 5-павярховымі дамамі. Паводле генеральнага плана 1981 г. пры ўездзе ў горад з паўночнага ўсходу створаны новы мікраараён. Вядзецца і катэджавае будаўніцтва.

Прамысловы комплекс горада прадстаўляюць 3 прамысловыя прадпрыемствы: ААТ «Верхнядзвінскі льнозавод», ААТ «Верхнядзвінскі масласырзавод», Верхнядзвінскае ЖКГ.

У Верхнядзвінску дзейнічаюць сацыяльныя ўстановы: гімназія імя Героя Савецкага Саюза І.А. Макеенка, сярэдняя школа № 2 імя Героя Савецкага Саюза Н.В. Траян, спецыялізаванная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву, дзіцячая школа мастацтваў, Цэнтр культуры і народнай творчасці, цэнтральная раённая бібліятэка імя Тараса Хадкевіча, гісторыка-краязнаўчы музей, Дом рамёстваў.





## БАРСТОК МАРЫНА МІКІТАЎНА
**(15. 04. 1916, в. Наркавічы Верхнядзвінскага раёна – чэрвень 1994, г. Мінск)**

Беларускі паэт, крытык. Літаратуразнаўца. Кандыдат філалагічных навук (1950). Член Саюза пісьменнікаў СССР (1951).

Нарадзілася ў сялянскай сям'і. Скончыла Полацкі педагагічны тэхнікум (1935). Выкладала мову і літаратуру ў Ветрынскай сярэдняй школе (1935-1937). Вучылася завочна ў Магілёўскім і Мінскім педінстытутах (1937-1939). Працавала загадчыкам аддзела культуры Брэсцкай абласной газеты «Зара» (1939-1940). У 1941-1943 гг. жыла ў Горкаўскай вобласці, працавала на заводзе. Скончыла філалагічны факультэт БДУ (1945). Вучылася ў аспірантуры пры Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР (1946-1949). У 1953-1956 гг. выкладала літаратуру ў Вышэйшай партыйнай школе пры ЦК КПБ. Загадвала сектарам мовы і літаратуры Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР.

З 1959 па 1979 гг. працавала навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Я.Купалы АН БССР.

У друку пачала выступаць з 1949 г. Напісала кнігі «Вобраз станоўчага героя ў творчасці Якуба Коласа» (1951), «Пятро Глебка» (1952), «Вывучэнне творчасці Кузьмы Чорнага ў школе» (1959; другое, дапоўненае выданне ў 1973), «Максім Багдановіч» (1961; другое, дапоўненае выданне ў 1974), «Адзінства і разнастайнасць сучаснай беларускай паэзіі» (1973), «Руплівы поўдзень: Нарыс творчасці Генадзя Бураўкіна» (1984). Выдала брашуру «Пятрусь Броўка» (1955), «Віднейшы беларускі дзіцячы пісьменнік Янка Маўр» (1958), «Максім Танк» (1962), «Вялікі Кастрычнік і беларуская літаратура» (1977) і інш.

Выступала ў перыядычным друку з вершамі і артыкуламі па пытанням дзіцячай літаратуры.

Даследавала беларускае опернае мастацтва, творчасць беларускіх кампазітараў. Складальнік зборнікаў артыкулаў пра Р. Шырму «Песня на ўсё жыццё», песень «Спадчына на вершы Я. Купалы і Я. Коласа» (Абодва 1983).



**ШУШКЕВІЧ ГАННА ПАЎЛАЎНА**
**(05. 04. 1936, в. Падгайскія Верхнядзвінскага раёна — 02.05. 2021, аг. Сар'я)**
**Герой Сацыялістычнай Працы**

Нарадзілася Ганна Паўлаўна 5 красавіка 1936 года ў в. Падгайскія ў сялянскай сям'і.

Яе ранняе дзяцінства прыйшлося на ваенныя гады: сям'я перажыла акупацыю, родная вёска была спалена фашыстамі дашчэнту. У цяжкія пасляваенныя гады з 14 гадоў стала працаваць у саўгасе «Дрысенскі» паляводам, а з 1953 года — свінаркай.

За дасягненне значных вынікаў атрымала званне перадавіка сельскагаспадарчай вытворчасці. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за высокія паказчыкі, дасягнутыя ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і выкананні пяцігадовага плана продажу дзяржаве прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі (1971).

Узнагароджана залатым медалём «Серп и Молот», двума ордэнамі Леніна і медалём «За доблестный труд».



**Захаваліся помнікі архітэктуры:**



**Свята-Мікалаеўская царква (1819)**



**Касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі (1809)**



**Жылы дом пачатку XX ст. , вул. Савецкая, 43**



## АСКНАЗІ ІСААК ЛЬВОВІЧ
**(16. 01. 1856, г. Дрыса – 1902, г. Масква)**

Акадэмік жывапісу (1885). Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1874-1879). За дыпломную работу «Распусніца перад Хрыстом» (1879) атрымаў вялікі залаты медаль. Працаваў у Італіі, Германіі, Польшчы (1880-1884). Вярнуўшыся, жыў у Віцебску. Пісаў карціны на міфалагічныя сюжэты («Майсей у пустыні» і інш.), а таксама жанравыя сцэны з жыцця гарадоў і мястэчак Беларусі («Прыход суботы» (1890), «Па пазыку» (1892) і інш.). Удзельнічаў у выстаўках Пецярбургскага аб'яднання мастакоў у 1887 г.

Падтрымліваў цесныя сувязі з І. Рэпіным.



## ГЕРОДНІК ГЕННАДЗЬ ІОСІФАВІЧ
**(02.02. 1911, Асвея Верхнядзвінскага раёна – 15.02.2000, г. Кейла Эстонія)**

Вучыўся ў Асвеі, Дрысе, Полацку. Скончыў Ленінградскі дзяржаўны ўніверсітэт (1939). Працаваў у г. п. Ветрына і ў Магілёве, дзе і застала яго вайна. Генадзь Іосіфавіч быў удзельнікам Сталінградскай бітвы, перажыў Ленінградскую блакаду. Быў узнагароджаны ордэнам Славы трэцяй ступені, шматлікімі медалямі. Дзень Перамогі сустрэў у г. Валга ў Эстоніі, дзе і пражыў усё астатняе жыццё. Працаваў дырэктарам сярэдняй школы, выкладаў матэматыку і фізіку. Літаратурную дзейнасць пачаў у 1949 годзе, стаў членам Саюза пісьменнікаў Эстоніі і з пачатку 60-х гадоў поўнасцю прысвяціў сябе літаратурнай дзейнасці.





## МАЛЕЙ АЛЯКСАНДР ВАСІЛЬЕВІЧ
**(27. 02. 1951, в. Садкоўшчына Верхнядзвінскага раёна)**

Беларускі мастак, аўтар шматлікіх жывапісных работ, аб'ектаў і інсталяцый, тэарэтык сучаснага мастацтва, педагог.

Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1973). Сябра Беларускага саюза мастакоў з 1982 года. Арганізатар творчага аб'яднання «Квадрат» (1987-1994). Удзельнік шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных выстаў. Жыве і працуе ў Віцебску.



## СІЗКО ВЕРА АЛЯКСАНДРАЎНА
**(02. 03. 1916, г. Верхнядзвінск (Дрыса) — 25.03.1999)**

Беларускі музыказнавец, музычны крытык, педагог, даследчык беларускага опернага мастацтва, творчасці беларускіх кампазітараў.

Скончыла Мінскі музычны тэхнікум (1940), Ленінградскую кансерваторыю (1948). У 1948-1952 і 1954-1957 гадах выкладала гісторыю рускай музыкі і загадвала вучэбнай часткай у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А.В. Луначарскага і адначасова ў 1948-1974 гадах (з перапынкам) у Мінскім музычным вучылішчы імя М. І. Глінкі. У 1959-1964 гадах працавала на Беларускім радыё: мастацкі кіраўнік, галоўны рэдактар музычнага вяшчання, старшыня музычна-рэпертуарнай камісіі. У 1974-1989 гадах выкладала ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце.